УДК 070.41.655

**У. І. Кулiковiч**, кандыдат фiлалагiчных навук, дацэнт (БДТУ); **А. В. Качан**, студэнтка (БДТУ)

# РЭДАКЦЫЙНА-ВЫДАВЕЦКАЯ МАДЭЛЬ ГАЗЕТЫ «НАША НІВА» Ў АЦЭНЦЫ ДАСЛЕДЧЫКАЎ

У артыкуле прадстаўлены і сістэматызаваны погляды даследчыкаў на рэдакцыйна-выдавецкую мадэль газеты «Наша ніва»: яе ролю ва ўмацаванні беларускага нацыянальнага руху, фармаванні беларускай нацыі, у станаўленні і развіцці беларускай літаратуры і мовы. Акцэнтуецца ўвага на перыядызацыі дзейнасці газеты, ідэйнай і тэматычнай скіраванасці, стаўленні ўлад да першага беларускамоўнага выдання, на цяжкасцях развіцця і функцыянавання. Робіцца выснова, што ў комплексе медыйная мадэль газеты «Наша Ніва» застаецца па-за ўвагай даследчыкаў.

In article sights of researchers at publishing model of the newspaper «Наша ніва» are presented and systematised: its role in strengthening of the Belarus national movement, formation of the Belarus nation, in formation and development of the Belarus literature and language., the relation of the authorities to the first Belarus edition, the attention to periodizations of activity of the newspaper, an ideological and thematic orientation is focused on difficulties of development and functioning. The conclusion becomes that in a complex the media model of the newspaper «Наша ніва» remains out of attention of researchers.

**Уводзіны.** У навуковай літаратуры тэрміны «рэдакцыйна-выдавецкая мадэль» і «медыйная мадэль» з'яўляюцца сінанімічнымі. Яны ўключаюць у сябе тры сэнсавыя складнікі. Першы з іх звязаны з дызайнерска-графічным кантэкстам, знешнім афармленнем і структурай вёрсткі выдання. Другі суадносіцца са зместам і пэўнай лінгвістычнай структурай матэрыялаў. Трэці — з медыйным мадэляваннем, маркетынгам, менеджментам, рэкламай і дзейнасцю па развіцці адносінаў з грамадскасцю [10].

Мэта нашага даследавання — прааналізаваць і сістэматызавана прадставіць погляды навукоўцаў адносна рэдакцыйна-выдавецкай мадэлі газеты «Наша Ніва». Задачы, якія ставіліся і вырашаліся, наступныя: 1) асэнсаванне ролі «Нашай Нівы» ў працах даследчыкаў; 2) асаблівасці функцыянавання газеты; 3) апісанне зместу і лінгвістычнай структуры матэрыялаў.

**Роля газеты «Наша Ніва».** Пытанні ролі газеты «Наша Ніва» асвятляюцца ў працах такіх даследчыкаў, як А. Унучак, С. Александровіч, В. Лукін, П. Навойчык, М. Рагойша, А. Мяснікоў і іншых, дзе найперш разглядаецца роля газеты ва ўмацаванні беларускага нацыянальнага руху, фармаванні беларускай нацыі, у станаўленні і развіцці беларускай літаратуры і мовы.

Паводле А. Унучака, з «Нашай Нівай» звязана станаўленне нацыянальнай ідэнтычнасці. Як сцвярджае навуковец, да 1915 года асноўныя тэарэтычныя падмуркі былі сфармуляваны і дастаткова распрацаваны. Прычым нашаніўцы «не проста напісалі пра ўнікальнасць беларускай культуры, што было зроблена да іх гоманаўцамі ды іншымі, а распрацавалі стратэгію развіцця культуры з мэтай зрабіць яе «высокай», г. зн. выйсці па-за этнаграфічныя рамкі» [1].

М. Рагойша акцэнтуе ўвагу на заслугах газеты ў станаўленні беларускага друку. Журналістамі выдання, — адзначае ён, — былі распрацаваны дэмакратычныя прынцыпы арганізацыі газетнага матэрыялу, вызначаны асноўны жанравы дыяпазон нацыянальнага друкаванага органа. Прадстаўленае праз шматлікія і разнастайныя газетныя формы тэматычнае напаўненне «Нашай Нівы» спрыяла фарміраванню культурнага прагрэсу. У творчай практыцы «першай беларускай газеты з рысункамі» выспявалі ўсе асноўныя выявы журналісцкага майстэрства, што вылучае сённяшняя навука, — метады справавой аналітыкі, інфармацыйны, публіцыстычны, эсэістычны, а таксама асобныя жанры гэтых метадаў як своеасаблівыя мадэлі адлюстравання пэўных фактаў і іх аналітычнай інтэрпрэтацыі» [5].

Мова «Нашай Нівы» стала аб'ектам вывучэння «як крыніца багатых, нікім не даследаваных і строга дакументаваных лексічных рэсурсаў» [8]. Як адзначае прафесар В. Лемцюгова — адзін з ініцыятараў складання «Слоўніка мовы «Нашай Нівы»: «Лексікаграфічнае асэнсаванне нашаніўскай спадчыны адкрывае рэальныя перспектывы для высвятлення многіх актуальных пытанняў сучаснай беларускай моўнай практыкі, у першую чаргу тых, які датычаць вызначэння літаратурнай мовы. Вяртаючы нас да вытокаў беларускай літаратурнай мовы, слоўнік тым самым пракладвае беларусам найкарацейшы шлях да іх нацыянальных культурна-моўных каранёў».

**Перыядызацыя.** Існуе тры найбольш вядомыя канцэпцыі падзелу часу функцыянавання газеты «Наша Ніва» на перыяды. Першая абапіраецца на асобу рэдактара, другая — на рэдакцыйна-выдавецкую палітыку, трэцяя — на тэматычную скіраванасць.

Паводле першай канцэпцыі, прапанаванай А. Унучакам, асноўным фактарам у працэсе акрэслівання перыядаў дзейнасці газеты варта лічыць асобу рэдактара. Такі падыход тлумачыцца найперш тым, што стваральнікамі «Нашай Нівы» цягам дзесяці год станавіліся таленавітыя і натхнёныя беларушчынай людзі.

З улікам гэтага фактара былі вылучаны тры асноўныя этапы: 1) 1906–1908; 2) 1909–1912; 3) 1912–1915.

На першым этапе працу ў рэдакцыі галоўным чынам накіроўваў А. Уласаў. Яго энтузіязм, спалучаны з ідэйнасцю захопленых справай братоў Луцкевічаў, спрыяў умацаванню «Нашай Нівы» як «факту грамадскага жыцця краю» [1].

Падчас другога этапу функцыянавання газеты захаванне кіраўніцтва спрыяла ўмацаванню і развіццю набытых за першы перыяд традыцый. Адметнай падзеяй стаў прыход у рэдакцыю «новай хвалі» беларускай інтэлігенцыі, што прывяло да так званай «дзвюхпалатнасці», паводле ўспамінаў В. Ластоўскага [6], сакратара «Нашай Нівы».

На трэцім этапе газетай кіраваў Я. Купала, які імкнуўся да захавання ідэйнай лініі рэдакцыйна-выдавецкай палітыкі ва ўмовах Першай сусветнай вайны і цэнзуры. Варта адзначыць, што Купала вырашаў ці далучаўся да вырашэння ўсіх пытанняў рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці, звязаных з «Нашай Нівай», у тым ліку і фінансава-эканамічных. Даследаваннне ролі Я. Купалы ў станаўленні і развіцці газеты стала асноўным тэматычным накірункам міжнароднай навуковай канферэнцыі «Янка Купала і “Наша Ніва”» (7–8.10.96, г. Мінск) [9].

А. Мяснікоў звязвае перыядызацыю газеты з рэдакцыйна-выдавецкай палітыкай: 1) 1906–1910; 2) 1910–1914; 3) 1914–1915.

Першы перыяд вызначаецца «апрабацыяй ажыццяўлення новых дэмакратычных прынцыпаў развіцця друку» [7] . Нягледзячы на пэўныя паслабленні ў цэнзуры з нагоды рэвалюцыйнага перавароту, рэпрэсіі працягвалі ажыццяўляцца. Таму праводзіць рэдакцыйную палітыку належным чынам было даволі складана. Аднак якраз у першыя пяць год «Наша Ніва» развівалася найбольш шпарка.

Другі этап характарызуецца выпрацоўкай новых поглядаў на рэфармаванне грамадства. Ідэі дэмакратычных пераўтварэнняў праз друк (на той час адзіным беларускім перыядычным выданнем, якое належным чынам падавала гэтыя ідэі, была «Наша Ніва») папулярызаваліся і даводзіліся да розных груп чытацкай аўдыторыі.

Падчас трэцяга перыяду газета ўсвядомілася як агульнапрызнанае беларускае выданне.

У аснове перыядызацыі, апісанай П. Навойчыкам, пакладзены літаратуразнаўчы аспект: 1) 1906–1908; 2) 1909–1915.

Першыя два гады газета займалася пераважна разглядам і абмеркаваннем сацыяльна-бытавых праблем, што адбівалася на існаванні застылага кола жанраў, за якое пісьменнікі не выходзілі.

Другі этап характарызуецца ўзнікненнем шэрагу новых жанраў (да прыкладу, лірычнай мініяцюры). Пошуку новых формаў спрыяла разнастайнасць тэм і праблем, якія ўсё больш актыўна абмяркоўваліся на старонках «Нашай Нівы». Асобна варта адзначыць з’яўленне і развіццё крытыкі, што сведчыць пра больш упэўненае станаўленне літаратуры [4].

**Стаўленне ўраду да дзейнасці газеты «Наша Ніва». Функцыянаванне ва ўмовах цэнзуры.** На розных этапах сваёй дзейнасці калектыў выдання быў вымушаны змагацца з афіцыйным адмаўленнем мэтазгоднасці абмеркавання некаторых тэм. Паводле С. Александровіча, адносіны атэстацыйнай камісіі да газеты мяняліся з цягам часу, што паказвае на неадназначнае стаўленне ўлады да факту існавання і функцыянавання «Нашай Нівы».

У 1907 годзе нумары некалькі разоў канфіскаваліся праз «змяшчэнне артыкулаў бунтоўнага характару». У наступным годзе камісія паставілася да газеты нейтральна, адзначыўшы, што выданне «адстойвае інтарэсы беларускага народа». З цягам часу нашаніўскія публікацыі выклікалі ўсё большае незадавальненне ўрада. Ужо ў 1913 годзе накірунак публікацый газеты быў ахарактарызаваны камісіяй як «умерана-апазіцыйны з імкненнем да аддзялення беларускай нацыі» [2].

Адпаведна перад рэдакцыяй увесь час стаяла задача, сфармуляваная С. Александровічам: «не гневячы «чорта», дагадзіць «богу»« [2]. Нашаніўцы былі вымушаны асцярожліва фармуляваць свае мэты з падкрэсліваннем асветніцкага характару выдання. Абставіны вымушалі да пошукаў новых формаў падачы матэрыялу, выпрацоўкі спосабаў і метадаў уздзеяння на аўдыторыю. Пастунова «Наша Ніва» набыла свой уласны стыль у вядзенні растлумачальна-прапагадысцкай дзейнасці: газета тонка і даходліва гаварыла фактычна пра ўсё, што хвалявала беларусаў, выдатна захоўваючы адзінства зместу і формы.

**Тэматычная скіраванасць газеты «Наша Ніва».** Называючы «Нашу Ніву» цэнтрам нацыянальна-культурнага адраджэння, В. Лукін акцэнтуе ўвагу на праграме выдачы газеты [3]. Спіс тэм, якія абмяркоўваліся на старонках газеты, ахоплівае ўсе найбольш значныя падзеі таго часу, што сведчыць пра імкненне рэдакцыі

пазбегнуць аднабаковасці і, як вынік, страты цікаўнасці з боку чытачоў.

Прывядзём назвы рубрык, якія мела «Наша Ніва»: 1) «Дзеянні ўрада»; 2) «Палітычны агляд»; 3) «Жыццё вёскі»; 4) «Жыццё горада»; 5) «Фельетон»; 6) «Новыя творы беларускай літаратуры»; 7) «Што чуваць на Белай Русі»; 8) «З Літвы»; 9) «Па Расіі»; 10) «Карэспандэнцыя»; 11) «З-за мяжы»; 12) «Што трэба і чаго не трэба чытаць»; 13) «Літаратурны дадатак»; 14) «Новыя кнігі»; 15) «З мінулага Беларусі»; 16) «Паштовая скрынка»; 17) «Сельская гаспадарка»; 18) «Практычная медыцына»; 19) «Прыкладная механіка»; 20) «Сумесь»; 21) «Аб'явы».

Паводле М. Рагойшы, «універсальнасць характару выданняў выяўляецца, як іх станоўчай рысай. І калі для сучаснай перыёдыкі поліфункцыянальнасць, стаўка на ўсеахопнасць можа быць часам расцэнена як пэўны недахоп (разнастайная арыентацыя звычайна не дазваляе дасягнуць цэласнасці выдання), то ў адаведных умовах такі тып выдання для беларусаў быў правільным і гістарычна апраўданым» [7].

**Ідэйная скіраванасць. Мэты і задачы «Нашай Нівы».** Паводле А. Унучака, структурна-тэматычная (рубрыкальная) будова газеты, згаданая вышэй, адпавядала мэце далучэння да нацыянальнага руху чытачоў розных катэгорый: відавочнае імкненне выдаўцоў да таго, каб «культурна, ідэйна, палітычна і канфесійна падзеленыя яе прадстаўнікі ўспрынялі ідэалогію "Нашай Нівы" і праз наваствораныя структуры гэтую ідэалогію распаўсюдзілі» [1]. Апісаная мэта стала штуршком да фармавання астатніх задач і стварэння канцэпцый існавання газеты.

Менавіта наяўнасць яскрава акрэсленай мэты дазволіла «Нашай Ніве» вылучыцца сярод іншых выданняў, якія мелі большыя наклады. Паступовае фармуляванне ідэй і замацаванне іх у свядомасці аўтараў, а пасля і чытачоў спрыяла фармаванню газеты як цэласнага выдання з уласным адметным абліччам.

Ідэі фармуляваліся ў адзінстве з праграмнымі ўстаноўкамі. Сацыяльна-эканамічная праграма беларускага нацыянальнага руху прадугледжвала рэформы ў трох сферах: эканамічнай, палітычнай, прававой. Аднак «Наша Ніва» не змагла абысці супярэчнасцяў наступнага кшталту: «дамагаючыся самакіравання, газета падтрымоўвала ў поглядах "польскую партыю"; выступаючы за канфіскацыю зямельных уладанняў мясцовых абшарнікаў, станавілася ідэйным саюзнікам агульнарасійскіх сацыяльных партый, якія лічылі пытанне аб самакіраванні ў нацыянальным "ускрайку" Расійскай імперыі другасным» [1].

«Прапольская» і «прарасійская» плыні беларускага руху паядноўваліся ў газеце на сацыялістычным грунце, што значна абмяжоўвала магчымасці супрацоўніцтва з маёмаснымі пластамі. Аддаленасць выдаўцоў «Нашай Нівы» ад шляхецкай эліты ўскладняла дасягненне нацыянальнай кансалідацыі сярод беларусаў, што не магло не адбіцца на далейшым лёсе беларускай нацыяльнай ідэі.

Аднак, нягледзячы на пэўныя цяжкасці, канцэптуальныя разважанні ў спалучэнні з арганізацыйнымі высілкамі прывялі газету да стварэння «школы беларускай думкі» [1].

**Цяжкасці ў працэсе развіцця і функцыянавання «Нашай Нівы».** Звяртаючыся да манаграфіі А. Унучака, адзначаем, што з прычыны гістарычных абставінаў «Наша Ніва» не магла паўнавартасна функцыянаваць ад самага пачатку. Існаваў шэраг цяжкасцяў, якія не дазваляў выданню мець устойлівае і паслядоўнае развіццё.

Паводле сведчанняў супрацоўнікаў рэдакцыі, адной з галоўных перашкод была нязвыкласць «селяніна і рабочага да чытання якіхколечы газет» [1]. Аднак, нягледзячы на разуменне гэтага, разрыў паміж рэальнай свядомасцю сялянства і той роляй, якую яму адводзіла «Наша Ніва», наклаў адбітак на ідэйнае развіццё беларускага нацыянальнага руху і на публіцыстыку «першай беларускай газеты з рысункамі». Сяляне не заўжды станоўча рэагавалі на заклікі інтэлігенцыі, успрымаючы гэта як спробы парушыць іх традыцыйны свет.

Да таго ж заклікі наконт неабходнасці адраджэння беларускай мовы як асновы нацыі не знаходзілі значнай падтрымкі ў народа, для якога першаснай усё ж была неабходнасць вырашэння зямельнага пытання. Таму пэўная частка публікацый успрымалася як абстракцыя, што змяншала цікавасць да газеты.

Цяжкасці ў наладжванні сеткі распаўсюду таксама адмоўна ўплывалі на развіццё выдання. Большая частка накладу разыходзілася ў вёсцы «праз местачковыя агентуры». Продаж праз агентаў каля 40% накладу замарожваў капітал на 2–3 месяцы, а газета выходзіла штотыднёва. Да таго ж распаўсюджанне праз дробныя агентуры прыводзіла да страты часткі грошай. Пытанні наконт фінансавай дапамогі з боку ўплывовых грамадскіх аб'яднанняў не знаходзілі вырашэння, застаючыся без адказу ад патэн-цыяльных крэдытораў. Павелічэнне колькасці падпісчыкаў расло вельмі павольна. У спалучэнні з фінансавымі цяжкасцямі гэта пазбаўляла рэдакцыю неабходных умоў для функцыянавання.

Аднак, нягледзячы на вышэйакрэсленыя цяжкасці, «Наша Ніва» сталася ўплывовым і значным выданнем, даўшы найменне цэламу этапу беларускай гісторыі і літаратуры. «Наша-

ніўскі» перыяд з'яўляецца яскравым сведчаннем феномена «першай беларускай газеты з рысункамі», што можна лічыць дастатковым доказам вартасці правядзення нашага даследавання.

**Заключэнне.** Аналіз навуковых крыніц, прысвечаных даследаванню функцыянавання газеты «Наша Ніва», дазваляе сцвярджаць наступнае:

1) літаратуразнаўцаў, мовазнаўцаў, гісторыкаў і журналістаў найперш цікавілі пытанні ролі «Нашай Нівы» ў развіцці беларускага нацыянальнага руху, нацыянальнай літаратуры і мовы, публіцыстыкі, аспекты перыядызацыі, тэматычнай і ідэйнай скіраванасці, «выжыванне» ва ўмовах цэнзуры, цяжкасці ў працэсе развіцця і станаўлення;

2) пэўную ацэнку ў навуцы атрымалі зместавы і рэкламна-маркетынгавы складнікі рэдакцыйна-выдавецкай мадэлі газеты «Наша Ніва»;

3) у комплексе медыйная мадэль газеты «Наша Ніва» застаецца па-за ўвагай даследчыкаў, што сведчыць пра актуальнасць гэтай тэмы, паколькі даследаванне рэдакцыйна-выдавецкай мадэлі першай беларускамоўнай газеты дазволіць устанавіць спецыфіку станаўлення нацыянальнага выдавецкага комплексу.

## Літаратура


1. Унучак, А. «Наша Ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906–1915 гг.) / А. Унучак. — Мінск: Беларуская навука, 2008. — 184, [2] с.

2. Александровіч, С. Х. Пуцявіны роднага слова / С. Х. Александровіч. — Мінск: Выдавецтва БДУ, 1971. — 245, [2] с.

3. Лукін, В. С. «Наша Ніва» — цэнтр на-цыянальна-культурнага адраджэння (1906–1915 гг.) / В. С. Лукін.— Мінск: БДПУ, 2000. — 35 с.

4. Навойчык, П. І. «Наша Ніва» і літаратурна-грамадскі працэс на Беларусі пачатку XX стагоддзя / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. — Мінск, 1996.

5. Рагойша, М. В. Жанрава-тэматычная структура газеты «Наша Ніва» і яе сацыякультурная роля // Веснік ГрДУ. — Гродна, 2007. — №3. — С. 28–32.

6. Ластоўскі, В. Ю. Выбраныя творы / В. Ю. Ластоўскі. – Мінск: Міжнар. Фонд «Бел. кнігазбор», 1997. – 510, [4] л. іл.

7. Мяснікоў, А. Ф. Традыцыі «Нашай Нівы» (1906—1915 гг.) і сучасная беларуская журналістыка / А. Ф. Мяснікоў // Сучасная журналістыка: актуальныя праблемы: зб. навук. артыкулаў / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва. — Мінск, 2009. — С. 57—645.

8. Слоўнік мовы «Нашай Нівы», 1906–1915: у 5 т. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. — Мінск: Тэхналогія, 2003– .

9. Янка Купала і «Наша Ніва» / склад. С. Панізнік. — Мінск: Бел. выдав. т-ва «Хата», 1997. — 197 с.

10. Газета «Moscow News» (1930–1980 гг.): редакционно-издательская модель: автореф. дис. канд. филол. наук: 10.01.10 / Т. Н. Косарева. — М., 2008. — 16 с.


*Паступіла 16.03.2011*